*УДК* 94(476):502.1

# ЭВАЛЮЦЫЯ СТРУКТУРЫ І ФУНКЦЫЙ ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ ПА АХОВЕ ЛЯСОЎ У БЕЛАРУСІ Ў 40-я гг. XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**І. В. Пугач,**
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 23.03.20

*UDC* 94(476):502.1

# EVOLUTION OF THE STRUCTURE AND FUNCTIONS OF STATE ADMINISTRATION BODIES ON PROTECTION OF FORESTS IN BELARUS IN THE 40S OF THE XIX – THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

**I. Pugach,**
*Postgraduate Student of the Department of the History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 23.03.20

Артыкул прысвечаны праблеме эвалюцыі структуры і функцый органаў дзяржаўнага кіравання па ахове лясоў у Беларусі ў 40-я гг. XIX – пачатку XX ст. Паказаны асноўныя этапы працэсу трансфармацыі дзяржаўнай лясной адміністрацыі і пашырэння яе функцыянальных абавязкаў з улікам спецыфікі развіцця края. На падставе аналізу інфармацыі крыніц робіцца высنова аб паспяховасці захадаў урада ў адзначаным кірунку і іх станоўчым значэнні для аховы і збераження лясоў Беларусі.

*Ключавыя словы:* беларускія губерні, дзяржаўная лесаахоўная адміністрацыя, палаты дзяржаўных маёмасцей, упраўленні дзяржаўных маёмасцей, лесаахоўныя камітэты.

The article is devoted to the problem of evolution of the structure and functions of the bodies of state administration on protection of forests in Belarus in the 40s of the XIX – the beginning of the XX century. It shows the main stages of the process of transforming the state administration and broadening of its functional responsibilities with the account of the specificity of the land. On the base of the analysis of the information from the sources the conclusion about successful work of the administration in the mentioned direction and their positive meaning for protection of the forests of Belarus is made.

*Keywords:* Belarusian provinces, state forest-protecting administration, houses of state properties, administration of state properties, forest-protecting committees.

*Уводзіны.* На працягу існавання Расійскай імперыі лясныя рэсурсы адыгрывалі важную ролю ў яе жыцці. З уваходжаннем тэрыторыі Беларусі ў склад Расіі ўрад распачаў шэраг мерапрыемстваў па яе інтэграцыі ў дзяржаву, якія закранулі і лясную справу. Доўгі час пільнаму нагляду падлягалі ў асноўным тыя лясы, выкарыстанне якіх забяспечвала патрэбы арміі і флоту. Паступовае ўзрастанне значэння лясоў для сацыяльна-эканамічнага жыцця, асабліва ў 40-я гг. XIX – пачатку XX ст., з'явілася стымулам да развіцця спецыяльнага апарату дзяржаўных органаў кіравання з мэтай рэалізацыі іх больш эфектыўнай аховы. Разам з тым, дадзеная праблема не найшла належнай увагі ў гістарычнай навуцы.

*Асноўная частка.* 26 снежня 1837 г. было створана Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, а яго дзейнасць пачалася з 1 студзеня 1838 г. [1]. У склад установы ўваходзілі Савет міністра, Канцылярыя міністра, Вучоны камітэт і тры дэпартаменты. Пад юрысдыкцыю міністэрства траплялі і казённыя лясы. Лясы, якія тэрытарыяльна адносіліся да беларускіх губерняў, былі падначалены чацвёртаму аддзяленню II Дэпартамента дзяржаўных маёмасцей. Згодна з палажэннем ад 30 студзеня 1839 г. лясное ведамства Міністэрства дзяржаўных маёмасцей атрымлівала ваеннае ўладкаванне, а таксама быў утвораны Корпус ляснічых [2]. Установа падзялялася на тры часткі, адпаведна тром дэпартаментам дзяржаўных маёмасцей. Агульнае загадванне ўсімі чынамі корпуса было даручана інспектару Корпуса ляснічых. Для павышэння эфектыўнасці нагляду за дзейнасцю лясных чыноў прызначаліся віцэ-інспектары. Згодна з палажэннем ад 18 студзеня 1843 г., для канцэнтрацыі спраў па лясной частцы ў адной інстанцыі аднаўлялася функцыянаванне Ляснога дэпартамента, які быў створаны ў 1798 г. і часова прыпыніў сваю дзейнасць 8 снежня 1811 г. [3]. Ён падзяляўся на шэсць аддзяленняў, сярод якіх былі інспектарскае, па кіраванні лясамі, ахове лясоў, арганізацыі правільнай лясной гаспадаркі, па выкарыстанні лясоў і падліковае. Адзначаным палажэннем ствараўся і такі дарадчы орган, як лясны спецыяльны камітэт, у задачы якога ўваходзіў разгляд лесатэхнічных пытанняў і прапаноў па лесаўпарадкаванні. У адпаведнасці з палажэннем ад 25 снежня 1853 г. з 1 студзеня 1854 г. да Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, у выглядзе вопыту, быў далучаны Дэпартамент карабельных лясоў Марскога міністэрства (скасаваны у 1860 г.) [4, 5]. У 1894 г. Міністэрства дзяржаўных маёмасцей было пераўтворана ў Міністэрства земляробства і дзяржаўных маёмасцей, а ў 1905 г. – у Галоўнае ўпраўленне земляробства і землеўпарадкавання [6; 7; 8, с. 4, 26].

У адпаведнасці з адзначаным адбываўся працэс фарміравання мясцовай лясной адміністрацыі. 30 красавіка 1838 г. было прынята рашэнне аб утварэнні губернскіх палат дзяржаўных маёмасцей. Ахова лясоў ускладалася на лясныя аддзяленні палат. Да іх юрысдыкцыі адносіўся нагляд за казёнымі, сялянскімі, спрэчнымі паміж казной і прыватнымі асобамі (ці іншымі ўстановамі) лясамі, а таксама за падатковымі ляснымі ўчасткамі і лясамі, прыпісанымі да розных ведамстваў, але не выключанымі з юрысдыкцыі дзяржаўнай лясной адміністрацыі [9]. У беларускіх губернях палаты дзяржаўных маёмасцей пачалі дзейнасць амаль праз два гады пасля выдання распараджэння аб утварэнні палат па ўсёй імперыі, што было звязана з прыняццем спраў ад казённых палат. Гэтай праблемай займаліся спецыяльныя падрыхтоўчыя

камісіі. 28 снежня 1839 г. было прынята рашэнне аб адкрыцці з 1 сакавіка 1840 г. мясцовых палат дзяржаўных маёмасцей. Іх лясныя аддзяленні падзяляліся на тры сталы. Першы, распарадчы, стол вёў справы па апісанні, межаванні, ахове лясоў і карыстанні імі, вылучэнні лясных участкаў для манастыроў, сельскіх абшчын, дзяржаўных сялян, водпуску лесу на будаўніцтва і рамонт, а таксама па ўліку асабістага складу. Другі, следчы, стол разбіраў справы, звязаныя з парушэннем ляснога заканадаўства ці са спрэчнымі лясамі. Трэці, бухгалтарскі, стол быў адказны за фінансавую справаздачнасць па лясной частцы. Лясныя аддзяленні ўзначальваліся губернскімі ляснічымі. Яны сачылі за выкананнем ляснога заканадаўства, каардынавалі дзейнасць лясных чыноў і лясной варты ў маштабах губерні, планавалі лесагаспадарчыя і лесаахоўныя мерапрыемствы. У дапамогу губернскім ляснічым прызначаліся вучоныя ляснічыя, якія замяшчалі іх у выпадку адсутнасці [9, 10, арк. 122, 123; 11, арк. 190]. Для аптымальнай арганізацыі дзейнасці мясцовага ляснога чыноўніцтва казённыя лясы падзяляліся на лясныя дачы. Згодна з тэрытарыяльным распалажэннем і плошчай, а таксама зыходзячы са зручнасці нагляду, лясныя дачы аб'ядноўваліся ў ляснiцтвы і лясныя ўчасткі. Тыя, у сваю чаргу, маглі быць арганізаваны ў спецыяльныя акругі ці, пазней, у раёны. На ўзроўні спецыяльных акругаў дзейнічалі акруговыя ляснічыя. Яны павінны былі займацца адпаведным справаводствам, выдачай гербавых білетаў на высечку лесу ў казённых дачах і рэалізацыю лесаматэрыялаў, праверкай стану дач, іх гаспадарчым апісаннем, кантролем за расчысткай прасек і ўстаноўкай межавых знакаў, а таксама ўдзельнічаць у разборы спраў па незаконных захопах і вынішчэннях падведамасных лясоў [12, арк. 437–443]. Ляснічыя і падляснічыя практычна выконвалі тыя ж функцыі па кантролі правільнага вядзення лясной гаспадаркі і папярэджванні парушэнняў ляснога заканадаўства, што і акруговыя ляснічыя, але на ўзроўні даручаных ім лясніцтваў і лясных участкаў адпаведна. Па распараджэнні адміністрацыі на падляснічых маглі ўскладацца функцыі па кіраванні лясніцтвамі [2; 9; 13]. Законам ад 2 красавіка 1845 г. пасада акруговага ляснічага была скасавана. У сувязі з гэтым для ажыццяўлення агляду лясоў і інспекцыі лясной варты было прынята рашэнне прызначыць ва ўсіх губернях акруговых лясных рэвізораў, а ўсе мясцовыя лясныя афіцэры атрымлівалі агульную назву – ляснічыя [14].

Ахова лясоў ад знясілення і вынішчэння патрабавала ад ляснога аддзялення не толькі актыўнай лесаахоўнай дзейнасці, якая заключалася ў наглядзе за нарыхтоўкай лясных матэрыялаў і правільнай яе арганізацыі, ажыццяўленні здымачных і лесаўпарадкавальных работ, арганізацыі правільнай працэдуры здачы і прыёму лясоў і пазбяганні яе правядзення зімой ці ў перыяд значных лясных нарыхтовак. Лясныя чыноўнікі павінны былі складаць ведамасці па ўсіх лясных дачах губерні, супрацоўнічаць з валаснымі і сельскімі старшынямі з мэтай папярэджвання ці выкрыцця лясных злачынстваў. Акрамя таго, яны прадстаўлялі свае меркаванні наконт дастатковасці ці недастатковасці прынятых лесаахоўных захадаў, разлічвалі прыкладныя выдаткі на ўтрыманне лясной варты [15, арк. 40 адв., 192–192 адв.; 16, арк. 35–36 адв.; 17, арк. 10–11, 78].

У 1866 г. было прынята рашэнне аб рэарганізацыі палат дзяржаўных маёмасцей у губернскія ўпраўленні дзяржаўных маёмасцей (з 21 снежня 1882 г. – Віленска-Ковенскае, Смаленска-Віцебска-Магілёўскае, Гродзенскае і Мінскае ўпраўленні дзяржаўных маёмасцей, а з 12 чэрвеня 1902 г. – Віленска-Ковенскае, Віцебска-Смаленскае, Гродзенскае, Мінскае і Магілёўска-Чарнігаўскае ўпраўленні земляробства і дзяржаўных маёмасцей) [18–20]. Згодна з палажэннем 21 снежня 1882 г., пасада губернскага ляснічага была скасавана. З гэтага часу за арганізацыю аховы казённых лясоў на мясцовым узроўні адказвалі лясныя рэвізоры, ляснічыя і іх памочнікі. Акрамя рэалізацыі на месцах лесаахоўнай палітыкі, лясныя чыны павінны былі збіраць звесткі пра даручаныя ім лясы, выказваць меркаванні пра іх найбольш зручны гаспадарчы падзел, ажыццяўляць спецыяльныя лесагаспадарчыя работы, кантраляваць працэс нарыхтоўкі і водпуску лесаматэрыялаў, весці адпаведную справаздачную дакументацыю, арганізоўваць мерапрыемствы па лесаразвядзенні і лесаўзнаўленні і г. д. Важную ролю ў дзейнасці органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання па ахове лясоў адыгрывалі з'езды лясных чыноў. Згодна з зацверджанымі 14 сакавіка 1896 г. міністрам земляробства і дзяржаўных маёмасцей «Правилами об участии лесных ревизоров в хозяйственной деятельности лесничих и о порядке составления и исполнения хозяйственных мероприятий в казённых лесах» лясныя рэвізоры былі абавязаны не радзей разу ў год склікаць на адпаведныя з'езды ў замацаваных за імі раёнах падначаленых ляснічых. На іх, згодна з мясцовымі ўмовамі, выпрацоўваліся прапановы па павышэнні эфектыўнасці лясной гаспадаркі і аховы лясоў [20; 21, с. 20–21; 93–122; 22, арк. 3; 23 арк. 1–8; 24, арк. 148–169].

Трэба заўважыць, што ў адзначаны перыяд урадам праводзілася спецыфічная палітыка па кадравым камплектаванні мясцовага ляснога чыноўніцтва. З аднаго боку, гэта выявілася ў мэтанакіраваным памяншэнні колькасці лясных чыноўнікаў каталіцкага веравызнання, што было выклікана імкненнем урада да пазбягання дэстабілізацыі грамадска-палітычнага становішча ў краі. Так, яшчэ ў 1835–1836 гг. больш за палову адпаведных служачых на тэрыторыі беларускіх губерняў адносіліся да каталікоў. Пры гэтым сярод лясных чыноў найбольшая колькасць каталікоў была зафіксавана ў Віцебскай (88,9 %), Віленскай (84,6 %) і Гродзенскай (71,4 %) губернях [25, арк. 222 адв.–235; 26, арк. 177 адв.–183, 184 адв.–193, 200 адв.–206; 27, арк. 342 адв.–370; 28, арк. 188 адв.–200; 29, арк. 297 адв.–299, 305 адв.–322]. Аднак сітуацыя рэзка змянілася пасля паўстання 1863–1864 гг. Так, 22 мая 1864 г. быў прыняты ўказ, адпаведна якому каталікам забаранялася займаць кіруючыя пасады ў органах дзяржаўнага кіравання. Гэта тычылася і лясных чыноў [30, арк. 71]. Ужо ў 1869 г. у складзе лясной адміністрацыі пяці беларускіх губерняў каталікоў было каля 5 %, а доля праваслаўных лясных чыноўнікаў – 72 % [31, с. 54–55; 32, с. 53–55; 33, с. 36, 38–40; 34, с. 97, 99–100; 35, с. 63, 65–66]. Пры гэтым пры найме на працу ў першую чаргу ўлічвалася палітычная добранадзейнасць служачых. Так, напрыклад, згодна са звесткамі за 1866 г., каля 68 % лясных чыноўнікаў Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў мелі медалі «За усмирение польского мятежа» [36, с. 60, 64, 65; 37, с. 32, 34, 35; 38, с. 24, 25, 27]. У 1869 г. у пяці беларускіх гу-

бернях такім медалём былі ўзнагароджаны каля 30 % лясных чыноўнікаў [31, с. 54–55; 32, с. 53–55; 33, с. 36, 38–40; 34, с. 97, 99–100; 35, с. 63, 65–66].

З другога боку, адметнай асаблівасцю разглядаемага перыяду трэба лічыць значны рост колькасці чыноўнікаў, якія валодалі спецыяльнай лясной адукацыяй. Гэта было следствам двух узаемазвязаных фактараў – павышэння ролі лясной гаспадаркі ў сацыяльна-эканамічным жыцці дзяржавы і развіцця лесазнаўства, а таксама сеткі лясных навучальных устаноў. Так, да канца XIX ст. сярод мясцовых загадчыкаў лясніцтваў, памочнікаў ляснічых і лясных кандуктараў большасць атрымалі неабходную адукацыю ў спецыяльных ВНУ, лясных вучылішчах ці ніжэйшых лясных школах. Так, напрыклад, у 1879 г. у Віленскай, Гродзенскай і Магілёўскай губернях 65,7 % загадчыкаў лясніцтваў мелі спецыяльную адукацыю, а ў 1900 г. – каля 85 % (астатнія скончылі ВНУ, дзе выкладаліся лясныя дысцыпліны). Для параўнання, у пачатку XIX ст. на тэрыторыі беларускіх губерняў доля лясных чыноўнікаў, якія валодалі лясной адукацыяй, складала каля 13 % [39, арк. 42–45; 40, арк. 60–63; 41, арк. 16–33; 42, арк. 36–43; 43, с. 54–56; 44, с. 25, 77, 86, 95, 110, 129, 139, 156, 167, 178, 186, 187; 45, с. 46, 47, 76, 84, 96, 108, 118, 128, 137, 147, 156; 46, с. 65, 66].

Трэба адзначыць, што доўгая фактычная адсутнасць кантролю з боку дзяржавы за прыватным лесаўладаннем прывяла да знясілення вялікай колькасці прыватнаўласніцкіх лясоў. У сувязі з гэтым 4 красавіка 1888 г. было выдадзена «Положение о сбережении лесов» [47]. Выкладзеныя ў ім захады падзяляліся на дзве групы: тыя, што ахоўвалі лясы ад вынішчэння і знясілення, і тыя, што заахвочвалі вядзенне ў лясных дачах рацыянальнай лясной гаспадаркі. Дзеянне «Положения…» распаўсюджвалася на лясы ўсёй Еўрапейскай Расіі незалежна ад іх маёмаснай прыналежнасці і толькі часова былі прадугледжаны пэўныя абмежаванні. Першапачаткова правілы не распаўсюджваліся на лясы, правы на якія былі зафіксаваны ў «владенных записях» і ва ўстаўных граматах. Гэтыя правілы не тычыліся і лясоў, якія перадаваліся казной ва ўласнасць ці арэнднае карыстанне розным установам і таварыствам, а таксама на прыватнаўласніцкія лясы ў некаторых губернях (у тым ліку ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай) і інш. На лясы, якія ахоўвалі вярхоўі рэк ці іх прытокі, было прынята рашэнне распаўсюдзіць дзеянне «Положения…». У поўным аб'ёме «Положение о сбережении лесов» было ўведзена ў беларускіх губернях у 1892 г. [48; 49, арк. 2, 7–8 адв].

Рэалізацыя «Положения…» ускладалася на губернскія лесаахоўныя камітэты, падначаленыя Міністэрству дзяржаўных маёмасцей. Віленскі, Віцебскі, Гродзенскі, Магілёўскі і Мінскі лесаахоўныя камітэты пачалі сваю дзейнасць восенню 1888 г. [50, арк. 69–71 адв., 78–78 адв., 82, 84]. Гэтыя ўстановы ўзначальваліся губернатарамі. Пад іх старшынствам у склад камітэтаў уваходзілі віцэ-губернатар (з 26 снежня 1888 г.), губернскі прадвадзіцель дваранства, старшыня акруговага суда, лясныя рэвізоры, старшыня губернскай земскай управы або яе член, абавязкова член губернскай прысутнасці або губернскай па сялянскіх справах прысутнасці і два члены з мясцовых лесаўласнікаў, якія выбіраліся губернскім земскім сходам. Да правядзення на тэрыторыі Беларусі земскай рэформы старшыня губернскай земскай управы замяняўся яшчэ адным членам ад лесаўласнікаў. Апошнія запрашаліся міністрам унутраных спраў па прадстаўленні губернатара, якое было заснавана на згоддзе губернскага прадвадзіцеля дваранства. Справаводства ўскладалася на мясцовых кіраўнікоў дзяржаўнымі маёмасцямі, іх памочнікаў ці лясных рэвізораў, а непасрэдны нагляд за лясамі здзяйснялі мясцовыя лясныя чыноўнікі. Па некаторых справах у камітэт запрашаўся прадстаўнік ведамства шляхоў зносін [47; 51, арк. 1–1 адв.; 52]. Лесаахоўныя камітэты павінны былі выконваць наступныя функцыі: аднясенне лясоў да катэгорыі ахоўных і выданне дазволу на ператварэнне лясных плошчаў у іншы від угоддзяў; спыненне распараджэнняў лесаўласнікаў аб правядзенні спусташальных высечак; устанаўленне тэрмінаў для штучнага аблясення ўласнікамі незаконна высечаных ці расчышчаных плошчаў; размеркаванне лясоў для нагляду паміж чынамі казённага ляснога ведамства, паліцыі і павятовых па сялянскіх справах устаноў, пры дапамозе якіх камітэты ажыццяўлялі лесаахоўныя і лесагаспадарчыя мерапрыемствы; прыцягненне да адказнасці вінаватых у парушэнні правілаў «Положения…»; разгляд скаргаў на прысуды па справах аб парушэнні «Положения…». Разнастайны склад і функцыянальная скіраванасць лесаахоўных камітэтаў рабілі іх адносна самастойнымі і незалежнымі ад упраўленняў дзяржаўных маёмасцей калегіяльнымі ўстановамі. Пастановы лесаахоўнага камітэта прызнаваліся сапраўднымі толькі тады, калі ў пасяджэнні, акрамя старшыні альбо асобы, якая яго замяняла, удзельнічалі губернскі прадвадзіцель дваранства, старшыня акруговага суда і старшыня губернскай земскай управы ці асоба, якая яго замяшчала. У выпадку нязгоды з рашэннямі камітэтаў прыватныя асобы, таварыствы і іншыя ўстановы маглі накіроўваць скаргі міністру дзяржаўных маёмасцей у двухмесячны тэрмін з моманту іх абвяшчэння. Першапачаткова скаргі падаваліся ў адпаведны лесаахоўны камітэт, які на працягу двух тыдняў павінен быў прадставіць іх міністру са сваімі тлумачэннямі [47]. Такое ўладкаванне лесаахоўных камітэтаў спрыяла адстойванню інтарэсаў казны пры захаванні інтарэсаў лесаўласнікаў.

*Заключэнне.* Такім чынам, вышэйпададзенае сведчыць аб тым, што ў 40-я гг. XIX ст. – пачатку XX ст. органы дзяржаўнага кіравання, якія ажыццяўлялі лесаахоўную дзейнасць на тэрыторыі беларускіх губерняў, прайшлі значны шлях развіцця. Эвалюцыя іх структуры і аптымізацыя функцыянальнай скіраванасці дазволілі ўраду ўстанавіць нагляд над істотнымі ляснымі плошчамі краю, што стварала спрыяльныя ўмовы для арганізацыі рацыянальнага лесакарыстання і зберажэння мясцовых лясоў.


*Літаратура и крыніцы*

1. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – 2-е собр. – Т. 12. – Отд. 1. – № 10834. – С. 1039 – 1053.
2. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 14. – Отд. 1. – № 11978. – С. 111 – 119.

*References*

1. Polnoe sobranie zakonov Rossijskoj imperii (dalej – PSZRI). – 2-e sobr. – T. 12. – Otd. 1. – № 10834. – S. 1039 – 1053.
2. PSZRI. – 2-e sobr. – T. 14. – Otd. 1. – № 11978. – S. 111 – 119.

3. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 18. – Отд. 1. – № 16461. – С. 32 – 35.
4. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 28. – Отд. 1. – № 27804. – С. 677 – 680.
5. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 35. – Отд. 1. – № 35687. – С. 414 – 418.
6. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 14. – Отд. 1. – № 10457. – С. 141 – 152.
7. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 25. – Отд. 1. – № 26172. – С. 289 – 290.
8. Устав лесной с Высочайше утвержденными мнениями государственного совета, решениями Правительствующего сената, важнейшими циркулярами Министерства земледелия и государственных имуществ и др. приложениями; сост. М. А. Цейль. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. : Типографии И. Г. Гершуна и Б. М. Вольфа, 1898. – XV, 404, 432 с.
9. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 13. – Отд. 1. – № 11189. – С. 405–654.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей – НГАБ у г. Мінску). – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 24.
11. НГАБ у г. Мінску. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 25.
12. НГАБ у г. Мінску. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 361.
13. ПСЗРИ. – 2 е собр. – Т. 14. – Отд. 1. – № 13035. – С. 989–1150.
14. ПСЗРИ. – 2 е собр. – Т. 20. – Отд. 1. – № 18882. – С. 305–306.
15. НГАБ у г. Мінску. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 221.
16. НГАБ у г. Мінску. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1348.
17. НГАБ у г. Мінску. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1895.
18. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 41. – Отд. 1. – № 44024. – С. 469–471.
19. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 2. – Отд. 1. – № 1258. – С. 469–471.
20. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 22. – Отд. 1. – № 21694. – С. 645–647.
21. Устав лесной с Высочайше утвержденными мнениями государственного совета, решениями Правительствующего сената, важнейшими циркулярами Министерства земледелия и государственных имуществ и др. приложениями; сост. М. А. Цейль. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. : Типографии И. Г. Гершуна и Б. М. Вольфа, 1898. – XV, 404, 432 с.
22. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. – Ф. 31. Воп. 1. Спр. 232.
23. НГАБ у г. Мінску. – Ф. 27. Воп. 2. Спр. 2950.
24. НГАБ у г. Мінску. – Ф. 27. Воп. 2. Спр. 3574.
25. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 85.
26. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 94.
27. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 111.
28. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 116.
29. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 117.
30. РДГА. – Ф. 1276. Воп. 1. Спр. 106.
31. Памятная книжка Виленской губернии на 1869 г. – Вильна : типография губернского правления, 1869. – VII, 213 с.
32. Памятная книжка Витебской губернии на 1869 г. – Витебск : типография губернского правления, 1869. – VI, 180 с.
33. Памятная книжка Гродненской губернии на 1869 г. – Гродно: типография губернского правления, 1869. – 139, XI, 180 с.
34. Памятная книжка Минской губернии на 1869 г. – Минск : типография губернского правления, 1868. – 341, 6 с.
35. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1869 г. – Могилёв : типография губернского правления, 1868. – V, 345 с.
36. Памятная книжка Виленской губернии на 1866 г. – Вильна : типография А. Сыркина, 1866. – VIII, 230 с.
37. Памятная книжка Витебской губернии на 1866 г. – Витебск : типография К. Вульфа, 1866. – VIII, 218, 144 с.
38. Памятная книжка Гродненской губернии на 1866 г. – Гродно : типография губернского правления, 1866. – 65, 50, 84 с.
39. РДГА. –Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1291.
40. РДГА. –Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1314.
41. РДГА. –Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1342.

3. PSZRI. – 2-e sobr. – T. 18. – Otd. 1. – № 16461. – S. 32 – 35.
4. PSZRI. – 2-e sobr. – T. 28. – Otd. 1. – № 27804. – S. 677 – 680.
5. PSZRI. – 2-e sobr. – T. 35. – Otd. 1. – № 35687. – S. 414 – 418.
6. PSZRI. – 3-e sobr. – T. 14. – Otd. 1. – № 10457. – S. 141 – 152.
7. PSZRI. – 3-e sobr. – T. 25. – Otd. 1. – № 26172. – S. 289 – 290.
8. Ustav lesnoj s Vysochajshe utverzhdennymi mneniyami gosudarstvennogo soveta, resheniyami Pravitel'stvuyushchego senata, vazhnejshimi cirkulyarami Ministerstva zemledeliya i gosudarstvennyh imushchestv i dr. prilozheniyami; sost. M. A. Cejl'. – 2-e izd., ispr. i dop. – SPb. : Tipografii I. G. Gershuna i B. M. Vol'fa, 1898. – XV, 404, 432 s.
9. PSZRI. – 2-e sobr. – T. 13. – Otd. 1. – № 11189. – S. 405–654.
10. NacyJanal"ny gistarychny arhiw Bjelarusi w g. Minsku (daljej – NGAB u g. Minsku). – F. 2514. Vop. 1. Spr. 24.
11. NGAB u g. Minsku. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 25.
12. NGAB u g. Minsku. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 361.
13. PSZRI. – 2 e sobr. – T. 14. – Otd. 1. – № 13035. – S. 989–1150.
14. PSZRI. – 2 e sobr. – T. 20. – Otd. 1. – № 18882. – S. 305–306.
15. NGAB u g. Minsku. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 221.
16. NGAB u g. Minsku. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 1348.
17. NGAB u g. Minsku. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 1895.
18. PSZRI. – 2-e sobr. – T. 41. – Otd. 1. – № 44024. – S. 469–471.
19. PSZRI. – 3-e sobr. – T. 2. – Otd. 1. – № 1258. – S. 469–471.
20. PSZRI. – 3-e sobr. – T. 22. – Otd. 1. – № 21694. – S. 645–647.
21. Ustav lesnoj s Vysochajshe utverzhdennymi mneniyami gosudarstvennogo soveta, resheniyami Pravitel'stvuyushchego senata, vazhnejshimi cirkulyarami Ministerstva zemledeliya i gosudarstvennyh imushchestv i dr. prilozheniyami; sost. M. A. Cejl'. – 2-e izd., ispr. i dop. – SPb. : Tipografii I. G. Gershuna i B. M. Vol'fa, 1898. – XV, 404, 432 s.
22. NacyJanal"ny gistarychny arhiw Bjelarusi w g. Grodna. – F. 31. Vop. 1. Spr. 232.
23. NGAB u g. Minsku. – F. 27. Vop. 2. Spr. 2950.
24. NGAB u g. Minsku. – F. 27. Vop. 2. Spr. 3574.
25. Rasijski dzJarzhawny gistarychny arhiw (daljej – RDGA). – F. 379. Vop. 8. Spr. 85.
26. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 94.
27. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 111.
28. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 116.
29. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 117.
30. RDGA. – F. 1276. Vop. 1. Spr. 106.
31. Pamyatnaya knizhka Vilenskoj gubernii na 1869 g. – Vil'na : tipografiya gubernskogo pravleniya, 1869. – VII, 213 s.
32. Pamyatnaya knizhka Vitebskoj gubernii na 1869 g. – Vitebsk : tipografiya gubernskogo pravleniya, 1869. – VI, 180 s.
33. Pamyatnaya knizhka Grodnenskoj gubernii na 1869 g. – Grodno: tipografiya gubernskogo pravleniya, 1869. – 139, HI, 180 s.
34. Pamyatnaya knizhka Minskoj gubernii na 1869 g. – Minsk : tipografiya gubernskogo pravleniya, 1868. – 341, 6 s.
35. Pamyatnaya knizhka Mogilyovskoj gubernii na 1869 g. – Mogilyov : tipografiya gubernskogo pravleniya, 1868. – V, 345 s.
36. Pamyatnaya knizhka Vilenskoj gubernii na 1866 g. – Vil'na : tipografiya A. Syrkina, 1866. – VIII, 230 s.
37. Pamyatnaya knizhka Vitebskoj gubernii na 1866 g. – Vitebsk : tipografiya K. Vul'fa, 1866. – VIII, 218, 144 s.
38. Pamyatnaya knizhka Grodnenskoj gubernii na 1866 g. – Grodno : tipografiya gubernskogo pravleniya, 1866. – 65, 50, 84 s.
39. RDGA. –F. 387. Vop. 28. Spr. 1291.
40. RDGA. –F. 387. Vop. 28. Spr. 1314.
41. RDGA. –F. 387. Vop. 28. Spr. 1342.

42. РДГА. –Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1345.
43. Памятная книжка Виленской губернии на 1900 г. – Вильна : губернская типография, 1899. – XV, 46, 336, 117, 94 с.
44. Памятная книжка Витебской губернии на 1900 г. – Витебск : губернская типолитография, 1900. – VII, 36, 243, 157 с.
45. Памятная книжка Гродненской губернии на 1900 г. – Гродно : губернская типография, 1899. – 30, 40, 314, 41, 76, 86 с.
46. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1900 г. – Могилёв : типография губернского правления, 1900. – IX, 211, XXIX, 112 с.
47. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 8. – Отд. 1. – № 5120. – С. 148–156.
48. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 12. – Отд. 1. – № 8560. – С. 318.
49. РДГА. – Ф. 387. Воп. 6. Спр. 35461.
50. РДГА. – Ф. 387. Воп. 4. Спр. 30790.
51. НГАБ у г. Мінску. Ф. 27. Воп. 2. Спр. 1679.
52. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 8. – Отд. 1. – № 5669. – С. 634–635.

42. RDGA. –F. 387. Vop. 28. Spr. 1345.
43. Pamyatnaya knizhka Vilenskoj gubernii na 1900 g. – Vil'na : gubernskaya tipografiya, 1899. – HV, 46, 336, 117, 94 s.
44. Pamyatnaya knizhka Vitebskoj gubernii na 1900 g. – Vitebsk : gubernskaya tipolitografiya, 1900. – VII, 36, 243, 157 s.
45. Pamyatnaya knizhka Grodnenskoj gubernii na 1900 g. – Grodno : gubernskaya tipografiya, 1899. – 30, 40, 314, 41, 76, 86 s.
46. Pamyatnaya knizhka Mogilyovskoj gubernii na 1900 g. – Mogilyov : tipografiya gubernskogo pravleniya, 1900. – IH, 211, HHIH, 112 s.
47. PSZRI. – 3-e sobr. – T. 8. – Otd. 1. – № 5120. – S. 148–156.
48. PSZRI. – 3-e sobr. – T. 12. – Otd. 1. – № 8560. – S. 318.
49. RDGA. – F. 387. Vop. 6. Spr. 35461.
50. RDGA. – F. 387. Vop. 4. Spr. 30790.
51. NGAB u g. Minsku. F. 27. Vop. 2. Spr. 1679.
52. PSZRI. – 3-e sobr. – T. 8. – Otd. 1. – № 5669. – S. 634–635.